Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза - асіпаўчане»*

# ПОМНІМ ГЕРОЯЎ ЗЯМЛІ АСІПОВІЦКАЙ



## ГАРЭЛІК Зіновій Самуілавіч

# ГАРЭЛІК
# Зіновій Самуілавіч

**(19.11.1904- 14.12.1969)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Нарадзіўся 19 лістапада 1904 г. у вёсцы Асіповічы, цяпер г.Асіповічы Магілёўскай вобласці Беларусі, у сям'і рабочага. Скончыў няпоўную сярэднюю школу. У 1919 годзе адным з першых уступіў у камсамол. У 1924 годзе сям'я пераехала ў Сімферопаль, дзе Зіновій Гарэлік скончыў Сімферопальскі камвуз. Працаваў у райкаме партыі ў горадзе Сімферопаль. Член ВКП (б)/ КПСС з 1927 года. У 1926-28 гадах служыў у ЧырвонайАрміі.**

**Перад самай вайной скончыў курсы ўдасканалення каманднага саставу "Выстрал". На фронце- з чэрвеня 1941 года, камандзір стралковай роты. Прымаў удзел у баях на Паўднёвым, Цэнтральным, Сталінградскім і І Беларускім франтах.**

**У баях пад горадам Данецк (Украіна)малодшы лейтэнант Зіновій Гарэлік быў цяжка паранены. Са шпіталя выпісаўсятолькі летам 1942 года і быў**

накіраваны камандзірам стралковага ўзвода ў Сталінград. Днём і ноччу тут ішлі баі. Часці Чырвонай Арміі з цяжкасцю адбівалі атакі варожых танкаў і пяхоты.Узвод малодшага лейтэнанта ГарэлікаЗ.С. абараняўся ў раёне трактарнага заводу і ўтрымаў сваю пазіцыю.За паспяховыя баявыя дзеянні ў баях пад Сталінградам. З.С. Гарэлік быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.Асабліва вызначыўся Гарэлік пад час дэсантнай аперацыі па фарсіраванню Дняпра.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 кастрычніка 1943 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм старэйшаму лейтэнанту Гарэліку Зіновію Самуілавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі “Залатая Зорка”.Вышэйшыя ўзнагароды Радзімы ўручыў Герою ў шпіталі сам генерал Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі.

З 1945 года капітан Гарэлік З.С. знаходзіўся ў запасе. Жыў і працаваў у Сімферопалі. Памёр 14 снежня 1968 года.

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**16-га кастрычніка 1943 года, ужо на пасадзе камандзіра стралковай роты 568-га стралковага палка, старэйшы лейтэнант Зіновій Гарэлік са сваімі байцамі першым у палку фарсіраваў раку Днепр ля вёскі Шчытцы Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці Беларусі.Заданне, якое атрымаў Зіновій Гарэлік ад камандавання, заключалася ў тым, каб дэсантную групу пераправіць на правы бераг Дняпра, захапіць у праціўніка плацдарм і гэтым забяспечыць магчымасць высадкі падмацавання для развіцця далейшага наступу.Цёмная вераснёўская ноч апусцілася на Днепр.**

**Кожны разумеў, што фарсіраваць яго справа не простая. Там, на правым беразе, размяшчаліся вялікія сілы праціўніка. Пад прыкрыццём цемры салдаты Зіновія Гарэліка спускалі на дняпроўскую ваду плыты, лодкі, усё, што магло служыць сродкам для пераправы. Усе былі насцярожаныя, маўклівыя, але дзейнічалі рашуча і хутка. Камандзір і салдаты разумелі, што ад таго, як яны справяцца са сваёй задачай, залежыць выкананне ўсёй аперацыі па фарсіраванні Дняпра.У роце Гарэліка адзін афіцэр. Гэта ён, старэйшы лейтэнант. Самаробны флот энергічна рухаўся праз раку да правага берага. Усе былі захоплены адной мэтай: дабрацца да сушы. Вось ужо і сярэдзіна ракі. І раптам дняпроўская чорная вада асьвяцілася яркім святлом ракет праціўніка. Фашысты выявілі**

дэсантнікаў. Рота адразу ж трапіла пад ўраганны агонь праціўніка.

Вось ужо і бераг. Камандзір разбіў роту на дзве групы і пад прыкрыццём кулямётаў пачаў захват невялікага ўчастка з флангаў.Першая задача заключалася ў тым, каб захапіць варожыя гарматы. Фашысты не чакалі такога рашучага і дзёрзкага штурма савецкіх воінаў.Старэйшы лейтэнант Гарэлік З.С. сам лёг за станкавы кулямёт і вывеў з строю разлікі адной гарматы двух кулямётаў гітлераўцаў. У гэты час праз Днепр перапраўляліся іншыя падраздзяленні. Гарэлік абраў прыдатны момант і павёў роту ў новую атаку. Ёй удалося захапіць вёску Шчытцы, авалодаць нямецкімі траншэямі і замацавацца на заходняй ўскраіне.Камандзір вызначыў, што адзіная дарога да берага ідзе праз вёску, і таму вораг паспрабуе вярнуць яе. Так яно і выйшла.

Неўзабаве быў атрыманы загад замацавацца на захопленай пазіцыі. Доўга чакаць не прыйшлося.Фашысты тут жа распачалі атаку, каб вярнуць страчаныя пазіцыі. Нясучы вялікія страты, гітлераўцы адступілі. Наступіла зацішша, а потым – новая атака. Пад прыкрыццём двух танкаў гітлераўцы зноў пайшлі ў атаку. Флангавым агнём з кулямётаў нашы байцы адрэзалі пяхоту ад танкаў. Яна залегла. Але танкі працягвалі ісці наперад. У нашых салдат не было танкавай зброі. Адбіваць атаку "тыграў" трэба было толькі гранатамі. Група смельчакоў на чале з камандзірам, ўзброеная звязкамі гранат, пачала прабірацца насустрач

танкам. І вось падбіты адзін, затым другіварожы танк. Атака захлынулася.

Але вораг не даваў і самай кароткай перадышкі роце Гарэліка. На яе пазіцыі фашысты накіравалі ўжо шэсць танкаў. Абстаноўка ўскладнялася. Адважныя салдаты роты не адступілі ні кроку назад. У гэты час падаспелі к пераправе праз Днепр артылерысты і ўдарылі з флангаў па танкам праціўніка. Адзін за адным яны ахуталіся дымам. Зноў атака адбіта. Рота Гарэліка кінулася ў контратаку і заняла частку лесу.

Гітлераўцы ўпарта супраціўляліся, хаваючыся ў лесе. Гарэлік вёў роту наперад. Падчас адной з перабежак камандзіра параніла ў руку. Камандзір палка Камінскі загадаў Гарэліку адыйсці ў тыл на перавязку. Але старшы лейтэнант папрасіў дазволу застацца з ротай. Улічваючы вырашальны момант бою, камандзір палка пагадзіўся.Метр за метрам прасоўваліся наперад байцы, выбіваючы ворага з лесу. Нечакана з-за дрэва перад Гарэлікам выскачыў нямецкі афіцэр і накіраваў на яго рэвальвер. У адно імгненне старшы лейтэнант ударыў яго пісталетам па галаве, і той не паспеўшы стрэліць, упаў на зямлю. У гэты момант зусім побач раздалася аўтаматная чарга, і Зіновій Гарэлік ўпаў. Ачуняў ён ужо ў шпіталі.

# ЛІТАРАТУРА

1. Горелик Зиновий Самуилович – Герой Советского Союза, род. в г.Осиповичи // Навечно в сердце народном. – Минск, 1984. – С. 124-125.

2. Горелик З.С. // Герои Советского Союза : краткий биограф. словарь. В 2 т. Т. 1. – Минск, 1987. – С. 354.

3. Горелик Зиновий Самуилович [Текст] : биографические данные Героя Советского Союза // Гордость и слава Могилёвщины. – Могилёв, 2005. – Т. 1 : Герои Советского Союза. – С. 141.

4. Горелик З.С. // Их именами названы… – Минск, 1987. – С. 155.

5. Звёзды немеркнувшей славы. – Симферополь : Таврия, 1984.

6. Радзіма Гарэліка З. С. // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўс. вобл. – Мінск, 1986. – С. 82.